*УДК 7.038.6“20”:7.01*

# Мастацкасць як філасофска-эстэтычная праблема і яе крытэрыі ў выяўленчым мастацтве ХХ стагоддзя

**Цыбульскі М.Л.**
***Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”, Віцебск***

*Артыкул прысвечаны аналізу сутнасці катэгорыі “мастацкасць” як праблемы тэорыі мастацтва і як філасофска-эстэтычнай праблемы ў цэлым. Мастацкасць агульнавядомая як сутнасны прынцып, паводле якога пабудавана практычна ўся гісторыя мастацтва ад старажытных часоў да ХХ стагоддзя, прынцып, які доўгі час лічыўся найважнейшым і служыў асновай філасофіі і тэорыі мастацтва, эстэтыкі і мастацтвазнаўства. Змены мастацкай рэальнасці ў ХХ стагоддзі, адыход ад традыцый класічнага разумення мастацтва спрыялі размыванню крытэрыяў мастацкасці.*

*Мэта даследавання – прааналізаваць мастацкасць як шматаспектны феномен, выявіць сутнасныя крытэрыі мастацкасці і іх змены ў кантэксце развіцця мастацтва ХХ стагоддзя.*

***Матэрыял і метады.** Асноўны вектар метадалогіі дадзенага навуковага артыкула вызначае міждысцыплінарны сістэмны падыход да праблемы мастацкасці. Катэгорыя “мастацкасць” разглядаецца як у гістарычным ракурсе, так і ў рэчышчы сучасных мастацкіх практык. У даследаванні выкарыстаны гістарыяграфічны і тэарэтыка-метадалагічны аналіз навуковых прац філосафаў, культуролагаў, мастацтвазнаўцаў, якія звярталіся да розных аспектаў мастацкасці.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.** У шырокім сэнсе слова “мастацкасць” ці не асноўная асаблівасць мастацтва, якая інтэгруе ў сабе шэраг параметраў (прыкмет мастацкасці) і якая непарыўна злучана з яго вобразнай прыродай. Мастацкасць адлюстроўвае ступень эстэтычнай дасканаласці твора, ступень майстэрства, выступае ў значэнні асноўнай сістэмнай якаснай характарыстыкі.*

*У ХХ стагоддзі пра мастацкасць пачалі казаць як пра сінтэтычную якасць мастацтва, што ўключае ўсе кампаненты, элементы твора. Крытэрыямі мастацкасці твора сталі лічыць не толькі сістэмнасць, цэласнасць, змястоўнасць твора, адзінства формы і зместу, але і ўзровень майстэрства, навізну і арыгінальнасць, эфектыўнае ўздзеянне на свядомасць і інш. Вырашыць праблему мастацкасці частка даследчыкаў спрабуе з дапамогай увядзення паняцця “парадыгма мастацтва”, якое вызначаецца як гістарычна своеасаблівы тып мастацкай ментальнасці, з адмысловымі сістэмаўтваральнымі якасцямі, што дазваляюць кожнай новай парадыгме змяняць паняцце мастацкасці. У мастацтве ХХ стагоддзя можна вылучыць некалькі парадыгмаў, якія пэўны час развіваліся паралельна.*

***Заключэнне.** Такім чынам, аўтар выяўляе магчымасць і некаторыя ўмовы ўжывання катэгорыі “мастацкасць” у дачыненні да мастацтва ХХ стагоддзя, пры гэтым адзначаецца неабходнасць парадыгмальнага падыходу да мастацкасці. Адначасова становіцца важным ахарактарызаваць мастацкасць у сучаснай “постмастацкай” парадыгме, вызначыць найважнейшыя ўласцівасці мастацкасці ў межах дадзенай парадыгмы, сярод якіх працэсуальнасць, правакатыўнасць, парадаксальнасць і інш.*

***Ключавыя словы:** мастацкасць, ХХ стагоддзе, мастацкія крытэрыі, эстэтыка, постмадэрнізм.*

*(Ученые записки. – 2017. – Том 24. – С. 91–97)*

# Artistry as a Philosophic and Aesthetic Issue and its Criteria in the XX Century Fine Arts

**Tsybulski M.L.**
***Educational Establishment “Vitebsk State P.M. Masherov University”, Vitebsk***

*The article dwells upon the analysis of the essence of the category of “artistry” as an issue of the theory of art and as a philosophic and aesthetic issue on the whole. Artistry is generally known as an essence principle on which practically all history of art from old times to the XX century is built, the principle, which was for a long time the most important and was the basis of philosophy and theory of art, aesthetics and art studies. Changes of the art reality in the XX century, departure from the traditions of classical understanding of art promoted blurring the criteria of artistry.*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail:* mtsybulsky@rambler.ru – **М.Л. Цыбульскі**

*The purpose of the research is to analyze artistry as a multiaspect phenomenon, to identify essence criteria of artistry and their changes in the context of the development of the XX century art.*

***Material and methods.*** *The main methodology vector of the work determines the interdisciplinary system approach to the issue of artistry. The category of artistry is considered both from the historical side and within contemporary art practices. Historiography and theoretical and methodological analysis of scientific works by philosophers, culture scientists, art critics who turned to different aspects of artistry, are used in the study.*

***Findings and their discussion.*** *In a wider sense the word artistry is almost a basic feature of art, which integrates a number of parameters (features of artistry) and which is closely connected with its image nature. Artistry reflects a stage of aesthetic completeness of a piece of work, a stage of skill; is represents a basic system quality characteristic.*

*In the XX century artistry was referred to as synthetic quality of art which includes all components, elements of a piece. Not only system character, integrity, content of a piece of work, unity of the form and the content became criteria of a work of art but also the level of skill, novelty and originality, efficient impact on the consciousness etc. A number of researchers try to solve the problem of artistry with the help of the introduction of the notion of "paradigm of art" which means historically peculiar type of artistic mentality with system building qualities which make it possible for every new paradigm to change the notion of artistry. In the XX century art one can identify several paradigms which developed parallelly for a period of time.*

***Conclusion.*** *Thus, the author identifies the possibility and some conditions for application of the category of artistry concerning the XX century art; at the same time, the necessity in a paradigm approach to artistry is pointed out. It is also important to characterize artistry in the contemporary post-art paradigm, identify most important features of artistry within a given paradigm among which are process, provocation, paradox etc.*

***Key words:*** *artistry, XX century, art criteria, aesthetics, Post-Modern.*

*(Scientific notes. – 2017. – Vol. 24. – P. 91–97)*

Мастацкасць агульнавядома як сутнасны прынцып, паводле якога пабудавана практычна ўся гісторыя мастацтва ад старажытных часоў да XX стагоддзя, прынцып, які доўгі час лічыўся найважнейшым і служыў асновай філасофіі і тэорыі мастацтва, эстэтыкі і мастацтвазнаўства. Менавіта мастацкасць да сярэдзіны мінулага стагоддзя для большасці эстэтыкаў і мастацтвазнаўцаў у былым СССР з'яўлялася важным крытэрыем сапраўднага мастацтва. "Мастацкасць як эстэтычная якасць сфарміравалася і дасягнула амаль сваіх вышынь, напрыклад у дачыненні да жывапісу, менавіта ў культурах кананічных" [1]. Пачынаючы з XVII ст., лічыць расійскі філосаф, гісторык эстэтыкі В. Бычкоў, назіраецца аб'ектыўнае зніжэнне ўзроўню мастацкасці ў еўрапейскім жывапісе ў цэлым, і адной з асноўных прычын гэтага зніжэння ён называе духоўнае здрабненне тэматыкі мастацтва. Сярод іншых прычын – актыўнае ўзрастанне папулярнасці рэалістычных тэндэнцый. Штодзённая рэчаіснасць у якасці аб'екта адлюстравання і адсутнасць мастацкага канона, на яго думку, "падразалі крылы нават вельмі таленавітым мастакам XVII–XIX стст." Гэта ўжо ў XVII ст. добра адчулі тэарэтыкі і майстры класіцызму, якія паспрабавалі абмежаваць тэматыку мастацтва толькі высокімі тэмамі, дэкларатыўна ўвесці мастацкія каноны і маніфеставаць у якасці галоўнага прадмета мастацтва эстэтычную якасць – прыгажосць [2].

Аднак ужо на пачатку XX стагоддзя фундаментальныя рысы, уласцівыя мастацкасці, змяняюцца. Мастацкая практыка мінулага стагоддзя паказала, што крытэрыі, па якіх ацэньваліся класічныя творы мастацтва, немагчыма ў поўнай меры выкарыстоўваць у дачыненні да новых рэалій мастацтва. Змена месца і функцыі мастацтва ў сацыякультурнай прасторы XX стагоддзя, трансфармацыі сучаснай эстэтычнай парадыгмы, шырокі дыяпазон мастацкіх адкрыццяў, пэўная "аўтаномнасць" развіцця мастацтва ў спалучэнні з фарміраваннем некласічнага тыпу мастацкай свядомасці спрыялі пашырэнню межаў і змене крытэрыяў мастацкасці. З'яўленне некласічных формаў мастацтва стала сведчаннем нараджэння прынцыпова новых мастацкіх ідэй, паспрыяла раскрыццю ўнутранага патэнцыялу мастацтва. І, разам з тым, мастацтва XX ст. усё часцей адмаўляецца ад прызнання крытэрыем мастацтва яго эстэтычнай якасці – мастацкасці. Пры гэтым прадстаўнікі contemporary art фактычна адмовіліся ад сутнасці мастацтва і захавалі нейкія другарадныя, маргінальныя яго характарыстыкі і функцыі (напрыклад, сацыяльна-палітычную значнасць ці візуальную рэпрэзентатыўнасць) [1, с. 3–14].

Сапраўды, авангардныя і постмадэрнісцкія накірункі мастацтва ў XX стагоддзі змянілі ўяўленне пра мастацкасць. Іншымі сталі крытэрыі мастацкасці, эстэтычныя ідэалы, пачалі выкрышталізоўвацца новыя формы мастацтва, такія як канцэптуальнае мастацтва, інсталяцыя, перформанс, хэпенінг і інш. У выніку ў дачыненні да мастацтва XX стагоддзя ўсё радзей пачалі весці размову пра праблемы мастацкай якасці твораў. Адсутнасць выразных крытэрыяў вызначэння якасці мастацкіх твораў паспрыяла замене традыцыйных эстэтычных катэгорый іншымі паняццямі. Наяўнасць змен у праблеме мастацкасці ў XX стагоддзі відавочная і для свайго асэнсавання патрабуе суаднясення прынцыпаў традыцыйнай і новай эстэтычных сістэм.

Мэта даследавання – прааналізаваць мастацкасць як шматаспектны феномен, выявіць сутнасныя крытэрыі мастацкасці і іх змены ў кантэксце развіцця мастацтва ХХ стагоддзя.

**Матэрыял і метады.** Актуальнасць дадзенага навуковага артукула абумоўлена тым, што ўжо ў ХХ стагоддзі ў сувязі са зменамі мастацкай рэальнасці, шматграннасцю формаў мастацтва, з адыходам ад традыцый класічнага разумення мастацтва адбывалася размыванне крытэрыяў мастацкасці. У той час менавіта тэарэтычнае асэнсаванне сутнасці мастацкасці спрыяе распрацоўцы метадалогіі мастацкай крытыкі, эстэтычных крытэрыяў адзнакі твораў мастацтва.

Праблема сутнасці мастацкасці ў кантэксце асэнсавання мастацкага досведу ХХ стагоддзя на працягу некалькіх апошніх дзесяцігоддзяў з'яўляецца ці не самай дыскусійнай. Пры гэтым пра мастацкасць разважаюць як у выпадку, калі разглядаюць мастацтва як адзіны працэс, у якім мастак, ягоны твор і глядач тоесна злучаны паміж сабой, так і ў сітуацыі, калі шукаюць крытэрыі мастацкасці ў канкрэтных сферах мастацтва, асобных творах. І гэта невыпадкова, бо складанасць і шматаспектнасть праблемы мастацкасці, безумоўна, абумоўлена і спецыфікай розных відаў мастацтва, дзе выяўляюцца тыя ці іншыя аспекты мастацкасці. Менавіта таму тое ці іншае меркаванне пра мастацкасць прадугледжвае валоданне крытыкам не толькі агульнымі законамі мастацтва, але і прыватнымі законамі развіцця асобных відаў мастацтва. Такім чынам, складанасць працэсу ацэнкі мастацкай творчасці заключаецца ў неабходнасці аб'ектыўныя асаблівасці мастацтва злучаць з асаблівасцямі іх праяўлення ў кантэксце канкрэтнага жанру, твора мастацтва.

Аналізу розных аспектаў мастацкасці як філасофскай, агульнаэстэтычнай і культуралагічнай катэгорыі прысвечаны навуковыя даследаванні Ю. Борава, У. Бранскага, В. Бычкова, В. Ванслава, Г. Гачава, В. Дзіянавай, М. Кагана, А. Катламанава, А. Крыўцуна, В. Лехцыера, Б. Лук'янава, Н. Манькоўскай, Я. Мукаржоўскага, В. Падарогі, Л. Сталовіча, М. Храпчанкі, М. Хрэнава, В. Чайкоўскай, Н. Шэйх-Заманавай, А. Якаўлевай, А. Якімовіча. Ці не часцей за ўсё праблема мастацкасці, пачынаючы з савецкага часу, уздымалася ў літаратуразнаўстве, дзе яна больш-менш грунтоўна распрацавана, пра што сведчаць даследаванні А. Весялоўскага, В. Вінаградава, С. Аверынцава, В. Цюпы, М. Храпчанкі, М. Гея і інш. Прыкметна, што і зараз у даследаваннях па філасофіі мастацтва, мастацтвазнаўстве робяцца спробы вызначыць тыпы мастацкасці, уласцівыя мастацтву ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя. У іх мадэлі сучаснай мастацкасці разглядаюцца як унутрана супярэчлівы феномен, робяцца спробы прааналізаваць некласічныя аспекты сённяшняй мастацкасці [3].

Кожны даследчык выбірае свой шлях да вывучэння праблемы мастацкасці: адны аддаюць перавагу гісторыка-храналагічнаму, сістэмнаму кантэксту, другія – парадыгмальным ці семіятычным прынцыпам; трэція – фармальным катэгорыям. Грунтоўным і пераканаўчым, на наш погляд, з'яўляецца шлях гістарычнага асэнсавання праблемы мастацкасці праз прызму парадыгмальнага падыходу, што ўласціва шэрагу сучасных аўтараў, такіх як В. Бычкоў, А. Рубцоў, В. Цюпа і інш. Паводле іх пазіцыі, "падчас гістарычнага руху парадыгмаў мастацтва раней адкрытыя грані мастацкасці не знікаюць, а толькі да вядомай ступені дэзактуалізуюцца, адыходзячы ў цень, але захоўваючы за сабой ролю культурных межаў дадзенага роду дзейнасці" [4]. Пры гэтым сістэмны падыход дазваляе разглядаць мастацкасць як сістэмную якасць усіх бакоў твора мастацтва, якая інтэгруе ў сабе шэраг параметраў-крытэрыяў. Такім чынам, пры даследаванні праблемы мастацкіх крытэрыяў варта зыходзіць са зменлівасці параметраў мастацкасці, іх залежнасці ад эстэтычнага ідэалу эпохі. Акрамя таго нельга не пагадзіцца з тым, што "прыйшоў час для фарміравання агульнай тэорыі мастацтваў, у задачы якой уваходзіла б, акрамя ўсяго іншага, раскрыццё прыроды мастацтва ў цэлым, не падзеленага на асобныя віды" [5].

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Напачатку варта адзначыць, што агульнай, распрацаванай для ўсіх відаў мастацтва тэорыі мастацкасці не існуе. І не выпадкова, паколькі мастацкасць нагадвае сабой складанае мноства, дзе не вызначаныя межы. У шырокім сэнсе слова мастацкасць ці не асноўная асаблівасць мастацтва, якая інтэгруе ў сабе шэраг параметраў (прыкмет мастацкасці) і непарыўна злучана з яго вобразнай прыродай. Мастацкасць адлюстроўвае ступень эстэтычнай дасканаласці твора, ступень майстэрства, выступае як асноўная сістэмная якасная характарыстыка. Увогуле менавіта мастацкасць сведчыць аб прыналежнасці аб'ектаў творчай працы да мастацтва, адрознівае іх ад іншых прадметаў і з'яў рэальнасці. Напрыклад В. Бычкоў адзначае, што пад мастацкасцю ён разумее эстэтычную якасць твора мастацтва, сутнасць якой заключаецца ў такой фармальна-змястоўнай яго арганізацыі, што выклікае ў рэцыпіента паўнавартасны працэс эстэтычнага ўспрымання. Узровень тэхнічнай дасканаласці валодання мастаком сваім рамяством – гэта яшчэ не сведчанне мастацкасці, прытым што апошняе з'яўляецца неабходнай перадумовай яе ўзнікнення. Мастацкасць – гэта сапраўды ўніверсальная эстэтычная каштоўнасць, якая фіксуе тыя каштоўнасці-крытэрыі, паводле якіх прадмет можа быць аднесены да сферы мастацтва.

Мастацкасць сапраўды ёсць увасабленне аднай з найважнейшых функцый мастацтва – эстэ-

тычнай. Усе астатнія (сацыяльная, асветніцкая, рэлігійная і інш.) – другарадныя. Відавочнымі прыметамі мастацкасці можна лічыць цэласнасць, завершанасць і арыгінальнасць твора мастацтва. Адпаведнае і адэкватнае ўвасабленне мастаком творчай задумы, паспяховае пераадоленне ім супярэчнасцей творчага працэсу з'яўляецца неад'емнай прыметай мастацкасці.

У класічным уяўленні мастацкасць – гэта наяўнасць у творы духоўнага пачатку ў спалучэнні з арыгінальнасцю і навізной эстэтычнай ідэі, формы, "выразна афарбаванай" індывідуальнасцю мастака. Звычайна мастацкасць твора тлумачыцца не проста як сплаў зместу і формы, але як іх арганічнае адзінства. Па сутнасці, формы мастацкасці разнастайна бязмежныя, паколькі яна праяўляецца ў спалучэннях усіх элементаў твора. Ужо ў такім вызначэнні мастацкасці падкрэсліваюцца зменлівасць дадзенага паняцця і яго залежнасць ад той ці іншай мастацкай парадыгмы, таго ці іншага тыпу мастацкай культуры грамадства.

Сапраўды, крытэрыі мастацкасці няўстойлівыя, гістарычна рухомыя, яны змяняюцца ў часе. У розныя эпохі грамадства развівае свае ідэйна-эстэтычныя ўяўленні пра крытэрыі мастацкасці. З'яўляючыся адной з цэнтральных праблем эстэтыкі, мастацкасць хвалявала старажытных філосафаў яшчэ з антычных часоў. Напрыклад, антычныя філосафы знаходзілі мастацкасць у сіметрыі, вонкавай гармоніі, прапарцыянальнасці, у строгай суразмернасці частак, у дасканаласці формаў. Кожная наступная эпоха накладала свой адбітак на характар мастацкасці і крытэрыі адзнакі мастацтва. У сувязі з гэтым і патрабаванні да мастацкасці ўвесь час змяняліся.

Нельга не пагадзіцца з тым, што "мастацкасць на метафізічным узроўні з'яўляецца адзіным сутнасным прынцыпам і крытэрыем сапраўднасці мастацтва і будзе заставацца ім да таго часу, пакуль чалавецтва канчаткова не страціць здольнасці да эстэтычнага досведу, да эстэтычнага ўспрымання свету" [1, с. 3–14]. Крытэрыі мастацкасці з'яўляюцца яе мадыфікатарамі на тым ці іншым гістарычным этапе, надаюць ёй адпаведныя часу ўзроўні.

Праблема крытэрыяў мастацкасці з'яўляецца вельмі важнай як для мастацтва XX стагоддзя, так і для нашага часу. У мінулым стагоддзі развіццё мастацтва адзначалася адыходам ад традыцый класічнай эстэтыкі, вылучалася стратамі каштоўнасных арыентацый чалавека ў сферы мастацкай практыкі. Ды і ў наш час зноў паўстала пытанне пра сутнасць мастацтва і крытэрыі мастацкасці, "узнікла патрэба ў новым падыходзе да праблемы якаснай адзнакі з'яў мастацтва" [6].

Сярод філосафаў, культуролагаў, мастацтвазнаўцаў нямала тых, хто сцвярджае, што не існуе аб'ектыўнага крытэрыю ці групы крытэрыяў, якія былі б агульнымі для ўсіх мастацкіх твораў і складалі б неабходную і дастатковую ўмову для таго, каб твор можна было лічыць мастацкім. Сапраўды, "хіба сутнасць мастацкага наогул ёсць нешта ўсеагульнае?" [7]. Пагаджаючыся з тым, што немагчыма вылучыць усе неабходныя і дастатковыя крытэрыі мастацкасці, мы паспрабуем у самых агульных рысах адказаць на пытанне, што ў наш час робіць мастацтва мастацтвам. І, такім чынам, падтрымаем тую частку даследчыкаў мастацкасці якая ідзе па шляху выяўлення яе крытэрыяў.

Безумоўна, крыніцай і крытэрыем выяўлення мастацкасці з'яўляецца густ. Увогуле мастацкасць – гэта вынік высокага эстэтычнага густу мастака, праява наяўнасці ў яго творчага патэнцыялу. Менавіта мастацкі густ са старажытных часоў выступаў галоўным крытэрыем мастацкасці, на якой будавалася ўся гісторыя сусветнага мастацтва [8].

Не выклікае сумненняў той факт, што крытэрыі мастацкасці падпарадкоўваюцца прынцыпу гістарызму, і таму кожны твор мастацтва павінен разглядацца ў рамках таго часу, той эпохі, у якой ён быў створаны. І, канешне ж, у фармаце пэўных відаў і жанраў. Цалкам бяссэнсава выводзіць крытэрыі мастацкасці з суаднясення таго ці іншага твора з высокімі ўзорамі мастацтва. Праўда, часам мастацкасць і прыгажосць могуць супадаць, але тым не менш іх нельга атаясамліваць (мастацкасць, напрыклад, трагічнай накіраванасці пазбаўленая прыгажосці).

Са старажытных часоў галоўным крытэрыем мастацкасці выступала эстэтычная асалода. Але эстэтычныя густы з цягам часу, безумоўна, змяняліся, таксама як змяняліся і прыметы мастацкасці твораў. На думку В. Бычкова, ці не ключавой эстэтычнай прыметай мастацкасці з'яўляецца духоўнасць. Гэта важная ўласцівасць мастацкасці праяўляецца ў яго змястоўнасці, напоўненасці мастацкіх твораў адпаведнымі ідэямі, думкамі, пачуццямі. Змястоўнасць мастацтва зусім не абавязкова прадугледжвае зварот да якіх-небудзь значных грамадска-палітычных і філасофскіх тэм і праблем. Змястоўнасць можа выяўляць сябе і ў такіх творах, дзе гаворка ідзе пра індывідуальныя (часам інтымныя) пачуцці, эмоцыі людзей, прытым што асэнсаванне глабальных пытанняў эпохі застаецца адным з асноўных клопатаў мастака.

Безумоўна, сапраўды ўніверсальнымі крытэрыямі мастацкасці з'яўляюцца крытэрыі цэласнасці і завершанасці твора мастацтва. Цэласнасць разглядалі як прынцып унутранай і знешняй арганізацыі твора яшчэ Шэлінг, Гегель, Бахцін. Але паняцце цэласнасці ў сваю чаргу таксама мае шмат аспектаў і змяняецца ў часе, а значыць не мае адназначнага тлумачэння.

Большасць аналітыкаў мастацтва лічаць самым агульным крытэрыем мастацкасці вобразнасць. Многія даследчыкі атаясамліваюць мастацкасць з мастацкай дасканаласцю твора. Адны з іх пры гэтым мастацкую дасканаласць звязваюць са змястоўнымі аспектамі твора, іншыя з форма-пластычнымі якасцямі твора. Успрымаючы мастацкасць як узровень ідэйнай значнасці твора, некаторыя даследчыкі лічаць форму усяго толькі сістэмай мастацкіх сродкаў, якія ілюструюць і аздабляюць асноўную ідэю твора. Такі тып узаемаадносін формы і зместу доўгі час панаваў у савецкім мастацтве, дзе, нягледзячы на дэкларыраванне адпаведнасці і ўзаемасувязі формы і зместу, прыярытэтную ролю аддавалі менавіта ідэі, зместу.

Многім даследчыкам мастацтва XX стагоддзя было ўласціва імкненне максімальна пашырыць крытэрыі мастацкасці, абапіраючыся на магчымасці сэнсавай і стылістычнай шматслойнасці твораў мастацтва. Пра мастацкасць пачалі казаць як пра сінтэтычную якасць мастацтва, што ўключае ўсе кампаненты, элементы твора і аб’ядноўвае іх у адно цэлае. Крытэрыямі мастацкасці твора сталі лічыць не толькі ўзровень майстэрства, сістэмнасць, цэласнасць, змястоўнасць твора; адзінства формы і зместу, але і навізну і арыгінальнасць, эфектыўнае ўздзеянне на свядомасць і інш. У той ці іншай ступені крытэрыем мастацкасці на этапе ўспрыняцця твора становіцца і суб’ектыўны густ гледача, які адлюстроўвае яго культурны ўзровень і эстэтычныя патрэбы. Ды і камерцыялізацыя мастацтва ў той ці іншай ступені таксама ўплывае на мастацкасць.

Цікавы і структураваны погляд на праблему мастацкасці прадстаўлены Марыяй Ільбекінай. З яе пункту гледжання, “мастацкасць” адказвае за магчымасць твора мастацтва выступіць у якасці “моста”, аднолькава неабходнага двум процілеглым бакам; 2) адрознівае творы ад ўтылітарна функцыянальных рэчаў, адказвае за прынцыпова іншую іх функцыю; 3) спрыяе развіццю сістэмы твораў мастацтва, дапамагае ўсім яе элементам імкнуцца да такой Дасканаласці, якая абсалютная, універсальная, бясконцая; 4) дынаміка і розны ўзровень “мастацкасці” дазваляюць ранжыраваць творы ў залежнасці ад ступені набліжанасці твора да “шэдэўра”) [9].

У сферы выяўленчага мастацтва большасць даследчыкаў бачыць рашэнне праблемы мастацкасці твора ў злучэнні шэрага класічных крытэрыяў (мастацкі вобраз, ідэйна-эмацыянальны змест) з некаторымі новымі “паказчыкамі”, якія могуць выкарыстоўвацца ў дачыненні да сучаснага мастацтва (наяўнасць эксперыменту, экстратэрытарыяльнасць, наратыўнасць і г.д.). Немалаважную ролю пры вызначэнні ўзроўню мастацкасці адыгрываюць такія пазамастацкія крытэрыі, як ступень папулярнасці аўтара, інвестыцыйная прывабнасць, мода і інш. Пры гэтым вызначальнай становіцца канкрэтная сітуацыя, у якой адбываецца пастаноўка пытання пра мастацкую каштоўнасць твора.

Сярод аналітыкаў мастацтва XX стагоддзя і мастацтва сучаснага нямала і тых, хто лічыць, што для кожнага віду мастацтва можна вылучыць цэлы пласт крытэрыяў змястоўнага парадку (якія шмат у чым ігнаруюцца сучасным мастацкім рынкам). Нярэдка агульныя крытэрыі злучаюць з катэгорыяй прыгожага. Сапраўдная прыгажосць выступае як інтэграцыйная характарыстыка, якая ўключае ў сябе такія параметры, як праўдзівасць, дабрыня, карыснасць, гарманічнасць [10]. Даследчыкі гэтай праблемы, напрыклад, Л.А. Закс, лічыць, што, калі мы хоць неяк рэагуем на рэальнасць сучаснага мастацтва, так ці інакш перажываем яе, і калі яна нам падабаецца, то такую ўласцівасць сучаснага мастацтва можна ўсё ж такі лічыць мастацкасцю [11, с. 175].

У агульным сэнсе фарміраванне крытэрыяў мастацкасці ў той ці іншы перыяд з’яўляецца вынікам узаемадзеяння і ўзаемаабумоўленасці многіх фактараў. Аднак “асноватворныя, базавыя складнікі мастацкасці таго ці іншага віду мастацтва, на наш погляд, застаюцца на працягу шматлікіх стагоддзяў нязменнымі. Для жывапісу гэта каляровыя і лінеарныя адносіны, кампазіцыйныя заканамернасці і ўсё тое, што спрыяе арганізацыі цэласнага жывапіснага палатна – жывапіснай мастацкай выявы, якую б форму яна ні прымала ў пэўных майстроў у тыя ці іншыя гістарычныя эпохі” [1, с. 3–14].

Вырашыць праблему “мастацкасці” частка даследчыкаў спрабуе з дапамогай увядзення паняцця “парадыгма мастацтва”, якую вызначае як гістарычна своеасаблівы тып мастацкай ментальнасці, з адмысловымі сістэмаўтваральнымі якасцямі. Гэтыя якасці дазваляюць кожнай новай парадыгме змяняць паняцце мастацкасці. Кожная з гістарычных парадыгмаў уяўляе сабою нейкую “тэрыторыю”, у межах якой становіцца магчымым наданне аб’ектам мастацкага статусу. Парадыгма ў рэчышчы таго ці іншага сацыяльна-гістарычнага кантэксту вылучаецца ўласнымі прыметамі мастацкасці. Прызнанне якога-небудзь аб’екта ў якасці мастацкага адбываецца ў выніку суаднясення яго з тыповым выпадкам у межах парадыгмы, г. зн. ніякі аб’ект не можа атрымаць мастацкі статус да таго часу, пакуль ён не будзе ўспрымацца такім у кантэксце вызначанай парадыгмы мастацтва.

Кандыдат філасофскіх навук А.В. Рубцова ў сваім дысертацыйным даследаванні на тэму “Гістарычнасць парадыгмаў мастацтва і праблема сучаснай мастацкасці” (Екацярынбург, 2004) вылучае чатыры парадыгмы, якія ахопліваюць

гістарычную тыпалогію існавання мастацтва, пазначаныя ёю як "пазаэстэтычная", "эстэтычная", "мастацкая" і "постмастацкая". У межах кожнай парадыгмы мастацтва выяўляецца своеасаблівае разуменне мастацкасці, выпрацоўваецца адмысловы погляд на мастацтва, якое прадвызначае як сам акт творчасці, так і ўспрыняцце яго вынікаў… "Пазаэстэтычная" парадыгма прадстаўляе мастацтва, напрыклад, як мімезіс, "эстэтычная" – тлумачыць яго як стварэнне цудоўнага, "мастацкая" – прапануе тэорыю "мастацтва для мастацтва". У сваю чаргу "постмастацкая" парадыгма раскрывае асаблівасці сучаснай мастацкасці, якая прызнае множнасць сэнсаў і, як вынік, дэфініцый і тэорый. Актуалізацыя новай парадыгмы, лічыць даследчыца, можа прадугледжваць новыя рысы мастацкасці.

На думку В. Цюпы, вывучэнне мастацкіх парадыгмаў выяўляе тыя глыбінныя працэсы, якія ляжаць у аснове гістарычных з'яў. Наяўнасць феномена духоўнасці аказалася, па меркаванні аўтара, неактуальнай у сучасным тэхнагенным грамадстве, што стала галоўнай прычынай з'яўлення пост-культуры, адной з галоўных асаблівасцей якой з'яўляецца нізкі ўзровень мастацкасці або яе поўная адсутнасць [4, с. 5–7].

У XX стагоддзі мастацтва развіваецца даволі імкліва і кожны з накірункаў, што ў вялікай колькасці з'яўляліся на мастацкай арэне эпохі, прыўносіў штосьці новае ў разуменне крытэрыяў мастацкасці. У мастацтве мінулага стагоддзя можна вылучыць некалькі парадыгмаў, якія пэўны час развіваліся паралельна. Гэта авангардызм, сацрэалізм, неатрадыцыяналізм.

У эпоху мадэрнізму адбылося значнае ўскладненне мастацкай мовы ў творах мастацтва, пашырыўся арсенал сродкаў выразнасці. Многія мастакі-авангардысты пачатку XX стагоддзя адкрыта заяўлялі аб "антымастацкасці" ўласнай творчасці. Многія творы гэтага часу разглядаюцца як маніфестацыя пэўных ідэй – палітычных, сацыяльных, пластычных. Крытэрыі мастацкасці ў мастацтве мадэрнізму практычна сфарміраваліся да 20-х гадоў XX ст., калі мадэрнісцкая эстэтыка ўжо прайшла этап станаўлення, і прынцыпы новай эстэтычнай канцэпцыі досыць трывала ўкараніліся ў мастацтве. Адным з галоўных крытэрыяў мастацкасці твораў мадэрністаў становіцца эксперыментатарства, вынаходніцтва тэхнікі выканання.

У другой палове стагоддзя, умоўна кажучы, пачынаючы з канцэптуалізму ў візуальных мастацтвах, мастацкасць наогул перастала фігураваць у лексіконе як даследчыкаў мастацтва, так і саміх творцаў. У сярэдзіне 1960-х амерыканскі мастак і тэарэтык мастацтва Алан Капроу ў апублікаваным маніфесце (1966) абвяшчаў, што мастак павінен рабіць што жадае, пры гэтым не трэба імкнуцца да прызнання яго дзеянняў мастацкімі.

У той жа час савецкая эстэтыка лічыла, што сапраўды мастацкім можа быць толькі той твор, дзе высокія ідэалы камунізму ўвасоблены ў адпаведную цудоўную форму. У савецкі час паняцце "мастацкасць" не лічылі самастойным і разглядалі яго ў адзіным рэчышчы з крытэрыямі праўдзівасці, ідэйнасці, народнасці і партыйнасці мастацтва. Але падобная пазіцыя, відавочна, у канчатковым выніку далучала мастацкасць да пазамастацкіх паняццяў.

У апошняй чвэрці XX стагоддзя сэнс катэгорыі "мастацкасць", здаецца, стаў канчаткова губляцца, а ўяўленні пра крытэрыі мастацкасці – размывацца. На першы план пачалі выходзіць падкрэслена суб'ектыўныя ўяўленні пра "добрыя" якасці таго ці іншага твора, ці такія спецыфічныя крытэрыі ацэнкі твораў, як актуальнасць. У гэты час якасна новай становіцца парадыгма мастацкасці постмадэрнізму, якая дэзактуалізуе тое, што дамінавала на папярэдняй стадыі. Мастацкасць разумеецца як інтэртэкстуальнасць, як мноства сэнсаў, якія з цягам часу трансфармуюцца. І разам з тым многія творцы канца мінулага стагоддзя, маніфестуючы адмову ад любых эстэтычных якасцей, у тым ліку і мастацкасці ўласных твораў, на практыцы стваралі артэфакты, у той ці іншай ступені мастацкасцю надзеленыя.

У дачыненні да мастацтва XX стагоддзя і асабліва мастацтва сучаснага праблема вызначэння межаў і сутнасці мастацкасці паўстае як тэарэтычна цяжка вырашальная. Сумненню падвяргаецца нават сама фундаментальнасць катэгорыі "мастацкасць". Многія аналітыкі, практыкі сучаснага мастацкага працэсу лічаць, што ў сучасным мастацтве адзіна магчымай з'яўляецца арыентацыя на мульцімастацкасць, якая азначае па сутнасці адмову ад адзіных крытэрыяў мастацкасці. Некаторыя даследчыкі бачаць адметныя рысы мастацкасці ў постмадэрнісцкай сітуацыі ў парадаксальнасці і правакатыўнасці. З дапамогай гэтых рыс мастацкасці творцы імкнуцца больш эфектыўна ўздзейнічаць на гледача. Мастакі звяртаюцца да тэм і праблем, якія традыцыйна існавалі за межамі мастацкага. Твор мастацтва пачынае асэнсоўвацца не як аб'ект, а як самадастатковы працэс. Мастакі эпохі постмадэрнізму запрашаюць гледачоў да сутворчасці і разам з тым правакуюць іх актыўнасць. Мастацкі аб'ект паўстае як дыскурс, у якім тоесна злучаны аўтар і глядач. Пры гэтым эстэтычнае перажыванне гледача павінна стаць самастойным унутраным "выказваннем", самабытнай інтэрпрэтацыяй створанага мастаком. І на гэтым этапе вядучым крытэрыем мастацкасці становіцца эфектыўнасць уздзеяння на свядомасць гледача.

На мяжы XX і XXI стагоддзяў мы можам казаць пра ўніверсальную, ненарматыўную парадыгму мастацтва, якая прызнае множнасць, варыятыўнасць мастацкасці і прадугледжвае існаванне ў рамках гэтай новай парадыгмы розных, але раўназначных падыходаў да мастацтва. Зыходзячы з таго, што распрацоўка адзіных крытэрыяў у такой велізарнай і цяжка акрэсленай межамі постмадэрніцкай прасторы немагчыма, некаторыя даследчыкі разважаюць аб магчымасці выкарыстання ў мастацтве нашага часу "канвенцыянальных" мастацкіх крытэрыяў [12].

**Заключэнне.** Такім чынам, дзякуючы магчымасці і выяўленню некаторых умоваў ужывання катэгорыі "мастацкасць" у дачыненні ды мастацтва XX стагоддзя, можна адзначыць і неабходнасць парадыгмальнага падыходу да мастацкасці. Пры вызначэнні ўзроўняў сэнсу "мастацкасці" на розных этапах у XX стагоддзі мы паспрабавалі ахарактарызаваць мастацкасць у сучаснай "постмастацкай" парадыгме, вызначыць найважнейшыя ўласцівасці мастацкасці ў межах дадзенай парадыгмы, сярод якіх працэсуальнасць, правакатыўнасць, парадаксальнасць і інш.

Відавочна, што катэгорыя "мастацкасць" выступае як сутнасная характарыстыка твораў мастацтва, даследаванне ўнікальнасці і шматпланавасці якой мае метадалагічнае значэнне для ўсяго мастацтвазнаўства. Крытэрыі мастацкасці з'яўляюцца важнымі арыенцірамі для вызначэння мастацкай каштоўнасці таго ці іншага твора. Пераасэнсаванне існуючай сістэмы каштоўнасцей, размыванне каштоўнасных арыентацый гледача і мастака, практычны вопыт развіцця мастацтва на мяжы XX–XXI стагоддзяў падкрэслілі неабходнасць пераасэнсавання і мастацкасці. Не выклікае сумненняў і тое, што па-ранейшаму вызначэнне крытэрыяў мастацкасці грунтуецца на агульначалавечым імкненні да гармоніі, прыгажосці, а сапраўдную мастацкасць адлюстроўваюць сукупнасць прымет, сярод якіх не толькі цэласнасць, адзінства формы і зместу, але і даступнасць твора мастацтва і нават шчырасць аўтара ў выражэнні сваіх думак і пачуццяў. Пры гэтым фундаментальнасць падыходаў да праблемы мастацкасці абапіраецца на імкненне разглядаць мастацтва ў адзінстве з усім матэрыяльна-духоўным жыццём чалавека.

## Літаратура


1. Бычков, В.В. Художественность как сущностный принцип искусства / В.В. Бычков // Вопросы философии. – 2015. – № 3. – С. 3–14.
2. Бычков, В. Эстетическая аура бытия: Современная эстетика как наука и философия искусства / В. Бычков. – М.: Изд-во МБА, 2010. – С. 442–470.
3. Давыденко, М.В. Концепции художественности в современной отечественной философии искусства и эстетике / М.В. Давыденко // Изв. Алтайс. гос. ун-та. – 2015. – Т. 1, № 3(87). – С. 111–115.
4. Тюпа, В.И. Парадигмы художественности (конспект цикла лекций) / В.И. Тюпа // Дискурс: коммуникация – образование – культура. – 1997. – № 3–4. – Режим доступа: http://www.nsu.ru/education/virtual/discourse34 22.htm. – Дата доступа: 31.07.2017. – С. 5–7.
5. Зись, А.Я. На подступах к общей теории искусства / А.Я. Зись. – М., 1995. – С. 30.
6. Рогачкова, М.В. Критерии художественности как искусствоведческая проблема / М.В. Рогачкова // Исторический опыт хозяйственного и культурного освоения Западной Сибири. Четвертые научные чтения памяти профессора А.П. Бородавкина: сб. науч. тр. / под ред. В.А. Скубневского и Ю.М. Гончарова. – Барнаул: Изд-во Алтайс. ун-та, 2003. – Кн. II. – С. 440–447.
7. Зедльмайр, Г. Искусство и истина: Теория и метод истории искусства / Г. Зедльмайр. – СПб., 2000. – С. 144.
8. Бычков, В.В. Художественность как метафизическое основание эстетического опыта и критерий определения подлинности искусства / В.В. Бычков, Н.Б. Маньковская // Вестн. славянск. культур. – 2017. – Т. 43. – С. 220–241.
9. Ильбейкина, М. «Художественность» как качественная характеристика произведений изобразительного искусства: тезисы: материалы Всерос. заоч. науч.-практ. конф. «Инновации гуманитарных и естественных наук». – Екатеринбург, 2010. – С. 151–152.
10. Давыденко, М.В. Проблема критериев художественности в контексте эстетического идеала современности / М.В. Давыденко // Национальное наследие и диалог культур как исток духовности современного общества. – Режим доступа: http://econf.rae.ru/article/7064. – Дата доступа: 01.04.2017.
11. Лисовец, И.М. Границы искусства: проблемы современной художественности. Первые еремеевские чтения, посвященные 75-летию А.Ф. Еремеева / И.М. Лисовец // Изв. Уральс. гос. ун-та. Сер. 3, Общественные науки. – 2009. – Т. 70, № 4. – С. 171–175.
12. Согомонов, А. Художественная вселенная: от сакрального к профанному качеству / А. Согомонов // Художественный журнал. – 2004. – № 55. – С. 4–10.


*Паступіў у рэдакцыю 01.09.2017 г.*